ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама

І.П.Шчасны

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю народнай інструментальнай музыкі “Іграю як знаю, скачу як хачу!”

Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення фестывалю народнай інструментальнай музыкі “Іграю як знаю, скачу як хачу!” (далей – Фестываль), які адбудзецца 2 чэрвеня 2024 г. ў аграгарадку Залессе Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці на базе філіяла “Раённы Дом рамёстваў” (пачатак фестывалю ў 11.00 гадзін).

1. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца:

захаванне, развіццё і папулярызацыя традыцыйнай музычна-інструментальнай культуры;

вывучэнне, практычнае засваенне і трансляцыя ўдзельнікамі Фестывалю народных лакальных музычна-інструментальных традыцый шляхам вуснага пераймання;

узбагачэнне духоўнага свету насельніцтва праз дэманстрацыю лепшых ўзораў народнага інструментальнага выканальніцтва;

захаванне і трансляцыя аўтэнтычнага народнага мастацтва, развіццё і прапаганда традыцыйнай спадчыны, папулярызацыя лепшых узораў народнага мастацтва з улікам фактару лакальнай спецыфікі і самабытнасці, далучэнне малодшага пакалення да гісторыка-культурнай спадчыны краіны і музычнай культуры;

фарміраванне ў дзяцей і моладзі нацыянальнай самасвядомасці, каштоўных напрамкаў беларускага грамадства ў накірунку асэнсавання значнасці традыцыйнай творчасці;

выяўленне і падтрымка музычна адораных людзей, развіццё іх творчага патэнцыялу;

абмен творчымі дасягненнямі і дэманстрацыя пераняятых мастацкіх уменняў у сацыякультурным побыце;

эстэтычнае выхаванне моладзі, садзейнічанне фарміраванню трывалай сувязі маладога пакалення са сваімі продкамі, сваёй гісторыяй і культурай.

2. Арганізатары Фестывалю: аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры” (Дадатак 1).

3. Фестываль праводзіцца адзін раз у два гады ў аграгарадку Залессе Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці на базе філіяла “Раённы Дом рамёстваў”.

4. У Фестывалі прымаюць удзел інструментальныя ансамблі, капэлы траістай музыкі, дуэты, індывідуальныя выканаўцы, дзіцячыя калектывы народнай інструментальнай музыкі.

4.1 У рамках Фестывалю праводзяцца майстар-класы па побытавых танцах (удзел па жаданню).

5. Удзельнікі Фестывалю могуць уваходзіць у склад аматарскіх фальклорных ансамбляў, самадзейных калектываў народнай творчасці ўстаноў адукацыі, культуры і мастацтваў, творчых суполак, музычных гуртоў традыцыйнай інструментальнай музыкі.

6. Удзельнікі падзяляюцца на наступныя катэгорыі:

удзельнікі ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў: ансамблі, дуэты, індывідуальныя выканаўцы, якія складаюцца з навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў, устаноў дадатковай адукацыі, устаноў культуры;

ансамблі, дуэты, індывідуальныя выканаўцы, якія складаюцца з дарослых людзей, якія не маюць вышэйшай музычнай адукацыі.

7. Да ўдзелу ў праграме Фестывалю калектывы рыхтуюць 3 народныя інструментальныя творы працягласцю не больш 4 хвілін кожны, перанятыя ад носьбітаў лакальных традыцый “з рукі на руку”, або асвоеныя з захаваных аўдыязапісаў беларускіх самабытных музыкаў шляхам вуснага пераймання.

8. Формы заявак (Дадатак 2) на ўдзел у Фестывалі, дасылаюцца на электронны адрас ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры” (rck@smorgony.by), або на паштовы адрас: 231042, г. Смаргонь Гродзенскай вобласці, вул. Ветэранаў, 9, да 15 мая 2024 г. Кантактны тэлефон 80159237314 (метадычны аддзел ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”).

9. Афіцыйныя запрашэнні да ўдзелу ў Фестывалі дасылаюцца пасля разгляду аргкамітэтам заявак і (пры неабходнасці) папярэдняга прагляду відэаматэрыялаў.

10. Удзельнікі Фестывалю ўзнагароджваюцца Дыпломамі і тэматычнымі сувенірамі ў дарослай і дзіцячай катэгорыях па наступных намінацыях: “Ансамблевае выканальніцтва”, “Дуэты”, “Сольнае выканальніцтва”. Арганізатары фестывалю пакідаюць за сабой права вызначаць іншыя намінацыі для ўзнагарод удзельнікаў.

11. Гледачы метадам інтэрактыўнага галасавання вызначаюць дыпламанта ў намінацыі "Прыз глядацкіх сімпатый", які ўзнагароджваецца Дыпломам і падарункам.

12. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, прадугледжаных у каштарысе аддзела культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта на цэнтралізаваныя мерапрыемствы. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы, рамкі да дыпломаў, тэматычныя прызы.

13. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі.

14. У праграме Фестывалю могуць прымаць удзел танцавальныя калектывы, альбо танцавальныя пары, якія прадстаўляюць танцавальную культуру свайго рэгіёна сумесна з калектывам ці капэлай траістай музыкі, дуэтам, альбо музыкам. Удзел танцавальных пар альбо калектываў пазначаецца ў заяўцы на ўдзел у Фестывалі;

арганізатарамі заахвочваецца правядзенне ў рамках Фестывалю майстар-класаў па побытавых танцах, характэрных для свайго рэгіёна агульнай працягласцю да 15 хвілін (пажадана ўказаць у заяўцы найменне танца і хто будзе праводзіць майстар-клас).

15. Фінансаванне выдаткаў па праезду і харчаванні ўдзельнікаў ажыццяўляецца за кошт накіроўваючага боку.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю народнай інструментальнай музыкі "Іграю як знаю, скачу як хачу!"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Барахоўская Л.П. | загадчык метадычнага аддзела ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Валодзька Дз.У. | дырэктар УК "Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей"; |
| Грышкевіч З.З. | старшыня Залескага сельскага выканаўчага камітэта; |
| Елфімава Н.В. | дырэктар ДУА "Смаргонская дзіцячая школа мастацтваў імя М.К.Агінскага"; |
| Зеновіч Т.В. | загадчык філіяла "Раённы Дом рамёстваў" ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Крацянок Г.І. | дырэктар ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" |
| Крывянкова В.К. | метадыст метадычнага аддзела ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Ражэва Т.М. | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Чудакоўская Н.С. | метадыст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны метадычнага аддзела ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю народнай інструментальнай музыкі "Іграю як знаю, скачу як хачу!"

# ЗАЯЎКА
на ўдзел у фестывалі народнай інструментальнай музыкі
"Іграю як знаю, скачу як хачу!"

1. Раён (горад) ________________________________

2. Поўная назва калектыву ________________________
3. База дзейнасці калектыву ________________________
4. Намінацыя ________________________________
5. Узроставая катэгорыя (дзіцячая, дарослая) ____________
6. Назва, паходжанне і працягласць кожнага твору
________________________________________
________________________________________
7. Наяўнасць танцавальнай пары, альбо танцавальнага калетыву (па жаданні ўдзельніка) ________________________
________________________________________
________________________________________
8. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву
________________________________________
9. Тэлефоны (службовы, мабільны)
________________________________________
10. Колькасць удзельнікаў ________________________
11. Творчая характарыстыка (не больш 50 слоў)

Кіраўнік базавай установы або калектыву _________ _______________

Заяўкі дасылаюцца на электронны адрас ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" (rck@smorgony.by) або на паштовы адрас: 231042, г. Смаргонь Гродзенскай вобласці, вул. Ветэранаў, 9, да 15 мая 2024 г. Кантакты: 8(01592) 37314